# 2025 г. – 90 гадоў з часу адкрыцця сямігадовай польскай школы імя Пілсудскага ў Кобрыне (ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Кобрына»; 1935)



Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 2 г. Кобрына» - адна са старэйшых навучальных устаноў Кобрыншчыны. Падмурак будучай школы быў закладзены ў 1926 годзе, аднак летапіс навучальнай установы вядзецца з 1935 года, калі быў уведзены ў эксплуатацыю асноўны корпус. Гэта была агульнаадукацыйная сямігадовая польская школа імя Пілсудскага для заможных гараджан.

У 1939 годзе, пасля далучэння зямель Заходняй Беларусі да СССР, школа стала беларускай. Галоўнай задачай школы-сямігодкі, размешчанай у працоўных наваколлях ільнозавода, была ліквідацыя непісьменнасці сярод моладзі. У перадваенны час школа стала васьмігодкай, але карэктывы ўнесла вайна: заняткі прыпыніліся. Падчас нямецка-фашысцкай акупацыі ў будынку школы знаходзілася конная жандармерыя.

З першых дзён вызвалення г. Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 годзе пачалося аднаўленне разбуранай гаспадаркі. Школа зноў працягнула працу - з верасня 1944 года, праўда, у розных памяшканнях горада, бо асноўны будынак рамантаваўся. З 1946 года ўстанова набыла статус агульнаадукацыйнай сярэдняй школы, у адзіннаццаці класах якой займалася 328 вучняў. Будынак школы па-ранейшаму знаходзіўся на рамонце і прыняў вучняў толькі ў 1947 годзе.

З 15 жніўня 1954 года навучальная ўстанова падпарадкоўваецца аддзелу народнай адукацыі выканаўчага камітэта Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў працоўных. У 1959-1964 гадах у школе не хапала памяшканняў, дзеці навучаліся ў тры змены, і толькі ў 1970-х гадах пачалася доўгачаканая рэканструкцыя: пабудавана восем класаў, навучальная майстэрня, сталовая, стадыён.

18 мая 1982 года ў школе адчыняецца музей Баявой славы, экскурсіі па якім праводзяць самі навучэнцы. У 1990 годзе ўведзены ў эксплуатацыю спартыўны манеж, а яшчэ праз чатыры гады прысвоены статус школы з паглыбленым вывучэннем нямецкай мовы. Навучэнцы

ўстановы штогод становяцца прызёрамі абласных і рэспубліканскіх алімпіяд па нямецкай мове, праходзяць моўную практыку ў швейцарскім горадзе Глярусе і нямецкім Ульцэне.

У 2008 годзе зроблены капітальны рамонт, школа змянілася, набыла сучасны выгляд. З 2013 года пачаў сваю дзейнасць рэсурсны цэнтр па вывучэнні нямецкай мовы, педагогі якой на павышаным узроўні рыхтуюць дзяцей да выпускных іспытаў. Прафесійны падыход да працэсу навучання дае свае выдатныя вынікі. Пры падтрымцы Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна і ўпраўлення адукацыі Кобрынскага райвыканкама адкрываюцца ліцэйныя класы па нямецкай мове. У пачатковых класах з'яўляюцца групы з вывучэннем англійскай мовы ў якасці замежнай. У школе паспяхова выкарыстоўваюць у рабоце методыку выкладання замежнай мовы міжнароднага праекта «Erasmus+».

За гады існавання СШ № 2 стала ініцыятарам сотні ініцыятыў. Гэта і турзлёты, і шматлікія спаборніцтвы, і працоўныя дэсанты ў гаспадарках раёна і ў кінатэатры «17 Верасня», і партнёрскія адносіны з гарадамі Швейцарыі і Германіі, і гады росквіту КВЗ-руху і станаўлення інтэлектуальнага клуба «Што? Дзе? Калі?» і шматлікае іншае, чым па праве ганарыцца не адно пакаленне выпускнікоў.

Адразу пасля вайны дырэктарамі школы працавалі Д. М. Юдзевіч, К. А. Капітонаў, потым дзевяць гадоў — А. А. Свінкін, з 1957 года па 1965 год — А. А. Дзяркач, далей І. Д. Рашэцька. 25 гадоў аддаў школе яе былы дырэктар А. Б. Беразоўскі (1964-1991). Свой уклад у адраджэнне і развіццё школы ўнеслі і іншыя кіраўнікі: А. Р. Субота, У. Р. Луцэнка, В. П. Іванюк, В. І. Шпак, А. Я. Міхалюк. Сёння на чале калектыву выпускнік СШ № 2 Аляксандр Яўгеньевіч Кудраўцаў, які пераняў усе лепшыя традыцыі, закладзеныя яго папярэднікамі.

У розныя гады ў школе працавалі і аддавалі свае веды і вопыт педагогі, удастоеныя высокіх урадавых узнагарод: заслужаныя настаўнікі Беларусі Н. І. Дудко, К. Д. Семянюк, Л. П. Урачова, выдатнікі народнай адукацыі СССР А. М. Адаміч, А. Б. Беразоўскі, Н. Ф. Лагвіновіч, В. Ф. Марчанка; настаўніца матэматыкі М. М. Нічык была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Сярэдняя школа № 2 ва ўсе часы была моцная сваімі

педагогамі. Сёння ў школе таксама працуюць прафесіяналы, граматныя і эрудзіраваныя настаўнікі, майстры сваёй справы. 46,90 % настаўнікаў маюць вышэйшую і 40,60% - першую кваліфікацыйныя катэгорыі, што сведчыць аб высокім узроўні падрыхтоўкі кадравага складу.

Ганарыцца школа і сваімі выпускнікамі, сярод якіх нямала годных людзей, тых, хто прынёс ёй асаблівую пашану і славу. Фасад школы ўпрыгожвае мемарыяльная дошка з адлюстраваннем самага вядомага выпускніка - Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Мікалаевіча Кірмановіча, а ў школе актыўна вядзецца пошукавая работа па зборы звестак з біяграфіі гэтай вядомай асобы. У ліку знакамітых выпускнікоў школы: М. І. Дзямчук— доктар фізіка-матэматычных навук, член-карэспандэнт Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, рэктар БДПА; У. І. Мурын— акадэмік Акадэміі геалагічных наук Расіі; К. М. Меярэвіч - заслужаны будаўнік Расіі, І. А. Чарота - доктар філалагічных навук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і СССР; Л. Р. Казлоў - беларускі гісторык, кнігавыдавец, прафесар, і многія іншыя. І цяпер у школе выхоўваецца нямала таленавітых вучняў - прызёраў і пераможцаў раённых і абласных прадметных алімпіяд, даследчых работ «Першацвет» і «Першыя крокі ў навуку», спартсменаў, эрудытаў і КВЗшчыкаў, якія не адзін год трымаюць пальму першынства ў раёне. ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Кобрына» пастаянна ўдасканальваецца і ўпэўнена займае дастойнае месца ў сістэме адукацыі Кобрына і раёна.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Бакун, Е.** Есть такая игра — "Зарница"... / Елена Бакун ; фото: Павел Дмитриев // Кобрынскі веснік. - 2024. — 20 красавіка (№ 16). — С. 15 : фот.

На базе центра военно-патриотического воспитания "Единство" в ГУО "Средняя школа № 2 г. Кобрина" состоялся районный этап республиканской спортивно-патриотической игры "Зарница".

**Бакун, Е.** Символам государства — уважение и почет / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 24 лютага (№ 8). — С. 14 : фот.

Первый районный смотр-конкурс знаменных групп "Будь готов" прошел на базе ГУО "Средняя школа № 2 г. Кобрина".

**Белов, Д.** Здесь растят защитников Отечества / Дмитрий Белов ; фото: Ирина Омельянчук // Кобрынскі веснік. - 2024. — 21 верасня (№ 38). — С. 6 : фот.

На базе средней школы № 2 г. Кобрина открыли обновленный районный центр допризывной подготовки и военно-патриотического воспитания "Единство".

**Вовк, Ю**. Воспитание патриотов / по новостям дежурили Юлия Вовк, Маргарита Сергеева // Заря. - 2024. — 21 сентября (№ 75). — С. 17 : фот.

В СШ № 2 г. Кобрина состоялось открытие обновленного Центра допризывной подготовки и военно-патриотического воспитания "Единство".

**Бакун, Е.** Вместе к цели / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 29 красавіка (№ 31). — С. 8 : фот.

На базе центра военно-патриотического воспитания "Единство" СШ № 2 г. Кобрина состоялась спортивно-патриотическая игра "Зарница".

**Бакун, Е.** Патриотов воспитывает "Единство" / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 1 сакавіка (№ 16). — С. 3 : фот.

В СШ № 2 г. Кобрина состоялось открытие центра военно-патриотического воспитания "Единство".

**Елизарова, Ж.** Помнить, чтобы не повторить / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2023. — 5 жніўня (№ 53). — С. 7 : фот.

В ГУО "Средняя школа № 2 г. Кобрина" прошли мероприятия, приуроченные к Дню всенародной памяти жертв Великой Отечественной войны и геноцида белорусского народа.

**Вовк, Ю.** Дарья Назарчук — мисс Весна-2022 / Юлия Вовк ; фото из личного архива Дарьи Назарчук // Кобрин-информ. - 2022. — 28 апреля (№ 17). — С. 4 : фот.

Ученица 11 класса СШ № 2 г. Кобрина Дарья Назарчук — победитель районного конкурса "Мисс Весна-2022".

**Вовк, Ю.** Дмитрий Бельский в шоу "Я знаю" / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2021. — 2 декабря (№ 48). — С. 6 : фот.

Учащийся СШ № 2 г. Кобрина Дмитрий Бельский — участник проекта Белтелерадиокомпании "Я знаю!"

**Елізарава, Ж**. Жыць, каб ствараць / Жанна Елізарава ; фота аўтара // Настаўніцкая газета. - 2021. — 4 лютага (№ 13). — С. 1 : фат.

Пра дырэктара СШ № 2 г. Кобрына А. Я. Кудраўцава, дэлегата VI Усебеларускага народнага сходу.

**Дубина, Л**. В режиме онлайн / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2019. — 11 мая. — С. 9.

Учащаяся СШ № 2 В. Крицкая — победитель и призер различных олимпиад.

**Елізарава, Ж.** Трэба проста любіць / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2019. — 5 кастрычніка. — С. 2 : фот.

Формула педагагічнага поспеху настаўніцы нямецкай мовы СШ № 2 Т. Бабій.

**Савчук, М.** От школьного сотрудничества к международному проекту / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 20 июня (№ 25). — С. 2 : фот.

СШ № 2 принимает участие в различных международных проектах.

**Бакун, А.** Калі праца ў радасць / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 20 чэрвеня. — С. 4.

Летні лагер СШ № 2 «Працоўная краіна 52/24» адзначыў пяцігоддзе.

**Бакун, А**. У адказе за тых, каго прыручылі / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 10 сакавіка. — С. 10.

Вучні пачатковых класаў СШ № 2 прымаюць удзел у конкурсе даследчых работ «Першацвет».

**Бармуцкая, К.** Ёсць у школе куточак самабытны ... / Ксенія Бармуцкая // Кобрынскі веснік. - 2018. — 28 ліпеня. — С. 9.

Этнаграфічны пакой СШ № 2 — куточак самабытнай культуры.

**Грышкевіч, С**. Лепшыя ў энергазберажэнні / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2018. — 23 студзеня. — С. 3.

Вучаніца СШ № 2 г. Кобрына В. Расцецкая — сярод пераможцаў абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Энергамарафон».

**Куц, Е.** И потрудились, и отдохнули! / Елена Куц // Заря. - 2018. — 3 ноября. — С. 7.

Летний лагерь труда и отдыха "Работающая страна 52/54" СШ № 2 занял первое место в республиканском конкурсе лагерей.

**Пальто, К.** Труд и отдых на достойном уровне / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2018. — 21 лістапада. — С. 2.

За организацию летнего лагеря труда и отдыха "Работающая страна 52/54" СШ № 2 стала обладателем большого хрустального зубра.

**Сахно, Н.** Колер настрою — летні / Наталля Сахно // Настаўніцкая газета. - 2018. — 8 чэрвеня. — С. 21.

На тэрыторыі СШ № 2 пяты раз арганізаваны палатачны лагер працы і адпачынку з кругласутачным знаходжаннем.

**Сянькевіч, А. У.** У прыярытэце лагер працы і адпачынку / [Ала Сянькевіч ; гутарыла Наталля Сахно] // Кобрынскі веснік. - 2018. — 31 мая. — С. 11.

Праект СШ № 2 па арганізацыі ЛПА заняў 1-е месца на заключным этапе Рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшы аздараўленчы лагер.

**Бакун, Е.** Учите языки / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 28 студзеня. — С. 2.

В ГУО "Средняя школа № 2 г. Кобрина" успешно используют в работе методику преподавания иностранного языка международного проекта "Erasmus+".

**Грэчка, І.** Хто працуе, таму шанцуе / Ігар Грэчка // Настаўніцкая газета. - 2017. — 2 лістапада. — С. 10.

Штодзенная, актыўная напруджаная праца — візітка сярэдняй школы № 2 г. Кобрына.

**Кузина, С.** Становление советского школьного образования на Кобринщине / Светлана Кузина // Кобрин-информ. - 2017. - 28 декабря. - С. 6.

**Пальто, К.** Новые старты и большие ставки / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. — 25 студзеня. — С. 3.

Команда КВН "Ставка" СШ № 2 успешно выступает на различных конкурсах.

**Пальто, К.** Проект объединения и дружбы / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. — 19 красавіка. — С. 2.

В рамках международного проекта "Erasmus+" в СШ № 2 принимали гостей из Германии.

**Савчук, М.** 40 лет спустя / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. — 31 августа. — С. 3.

Вспоминали школьные будни выпускники СШ № 2.

**Афанасьева, С**. Зрабі сябе сам! / Святлана Афанасьева // Народная трыбуна. - 2016. — 1 красавіка. — С. 9.

На абласным маладзёжным форуме лідарскі дуэт з СШ № 2 г. Кобрына атрымаў тытул "Лідар года".

**Ефціфеева, Н.** Лепшыя лідары вобласці / Наталля Ефціфеева // Кобрынскі веснік. - 2016. — 6 красавіка. — С. 8.

На абласным конкурсе галоўны тытул "Лідар года" атрымаў дуэт з СШ № 2 г. Кобрына.

**Гурская, Л.** Юныя лідары - за мір! / Людміла Гурская // Настаўніцкая газета. - 2016. — 26 мая. — С. 8.

Дзесяцікласнік з СШ № 2 г. Кобрына К. Абразцоў прымаў удзел у IV Рэспубліканскім аглядзе-конкурсу "Лідар года - 2016".

**Тимошук, А**. Лидеры из лидеров / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 23 сакавіка. — С. 5.

К. Образцов, учащийся СШ № 2 г. Кобрина, занял первое место на районном этапе смотра-конкурса "Лидер года-2016"среди учащихся школ города и района.

**Дубіна, Л.** Валанцёрства - стан душы / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. — 19 снежня. — С. 3.

У СШ № 2 функцыянуе гурток "Валанцёры".

**Казакова, А.** Школа, сильная традициями / Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2015. – 10 декабря. – С. 7.

Свой юбилей отпраздновала одна из старейших школ Кобрина – средней школе № 2 исполнилось 80 лет.

**Ніжнік, Н**. У альма-матар - праз 50 гадоў / Наталля Ніжнік // Кобрынскі веснік. - 2015. — 15 жніўня. — С. 4.

Адбылася сустрэча выпускнікоў СШ №2 г. Кобрына, якія 50 гадоў таму назад закончылі школу.

**Тимошук, А.** Бесценна память поколений / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2015. — 9 снежня. — С. 1, 2.

СШ № 2 отметила свой 80-летний юбилей.

**Савчук, М.** В. Германию для общения / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2014. — 17 июля. — С. 5.

В рамках проекта «Креативный диалог» - изучение немецкого языка в игровой форме – группа детей и учителей СШ № 2 побывала в Германии.

**Савчук, М.** Уникальный проект продолжается / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 14 ноября. — С. 3.

Второй раз группа учеников СШ № 2 участвует в международном проекте "Креативный диалог", основной целью которого является изучение немецкого языка в игровой форме.

**Жук, Е**. Шпрехен зи дойч? / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2012. - 17 октября. - С. 6.

В СШ № 2 г. Кобрина немецкий язык изучают со всей серьезностью.

**Литошенко, М.** Это надо было видеть! / Маргарита Литошенко // Кобрин-информ. - 2012. - 25 октября. - С. 29.

Команда СШ № 2 стала обладателем Осеннего кубка КВН.

**Савчук, М.** Итог стараний - знакомство с Германией / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2012. - 5 июля. - С. 3.

Участники проекта «Креативный диалог» с участием учеников СШ № 2 г. Кобрина посетили Геранию.

**Савчук, М.** Итог уникального проекта - поездка в Германию / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2011. – 27 октября. - С. 3 ; Кобрынскі веснік. - 2011. - 9 лістапада. - С. 1.

В СШ № 2 уроки немецкого языка проводила учитель из школы Берлина.

**Кудрявцев, А. В.** "Доброе начало в детях нужно поддерживать и приумножать" / А. В. Кудрявцев ; [беседовала] С. Веремеенко // Кобрин-информ. - 2010. – 25 марта. – С. 3.

Интервью с новым директором СШ № 2 А. В. Кудрявцевым.

**Веремеенко, С.** Памятная встреча / Светлана Веремеенко // Кобрин-информ. - 2009. - 8 октября. - С. 2.

Юбилейная встреча выпускников 1959 года состоялась в СШ № 2.

**Белов, Д.** Деревья на память / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 26 красавіка. - С. 3.

Выпускниками СШ № 2 была заложена аллея Выпускников.

**Курига, Е.** Путёвка в жизнь - талант / Елена Курига // Кобрин-информ. - 2008. - 28 февраля. - С. 6.

Учащаяся СШ № 2 г. Кобрина И. Ефимова – победитель областного этапа республиканской олимпиады по немецкому языку.

**Неделя** немецкого языка // Кобрин-информ. - 2007. – 19 апреля. - С. 3.

СШ № 2 более 10 лет работает по программе углубленного изучения немецкого языка.

**Олейник, Е**. Второе рождение : мы і нашы дзеці / Евгений Олейник // Кобрынскі веснік. - 2007. – 1 жніўня. - С. 3.

О ходе ремонта СШ № 2.

**Савчук, М.** А. Е. Михалюк: школа № 2 готова дать хорошие знания / М. Савчук // Кобрин-информ. – 2006. – 21 сентября. – С. 2.

**Встреча** через 45 лет // Кобрынскі веснік. – 2005. – 20 ліпеня. – С. 2.

Встреча выпускников СШ № 2 1960 года.

**Савчук, М.** В новый учебный год с новым директором / М. Савчук // Кобрин-информ. – 2004. – 2 сентября. – С. 1, 2.

Директором СШ № 2 назначен В. И. Шпак.

**Иванюк, В. П**. Иностранные языки для лицеистов / В. П. Иванюк // Кобрин-информ. – 2003. – 5 июня. – С. 2.

**Решение** Совета специального фонда Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренных учащихся и студентов // Настаўніцкая газета. – 2003. – 13 мая. – С. 4.

В числе других – учащийся 10 класса СШ № 2 г. Кобрина В. Бабий.

**Савчук, М.** Моё хобби – это мои ученики / М. Савчук // Кобрин-информ. – 2002. – 10 октября (№ 31). – С. 12.

Об учителе немецкого языка СШ № 2 С. Н. Печалиной.

**Белымі** воронамі не былі // Кобрынскі веснік. – 1997. – 5 лістапада. – С. 2.

Вучні СШ № 2 г. Кобрына пабывалі ў Швейцарыі і Германіі.

**Мартынов, А.** Биография юбиляра / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1995. – 12 верасня. - С. 2.

К 60-летнему юбилею СШ № 2 г. Кобрына - о школе-юбиляре и об истории образованию в Кобрине с начала XX ст.

**Шугай, А.** 60-гадовы юбілей СШ № 2 / А. Шугай // Кобрынскі веснік. – 1995. – 15 лістапада. – С. 3.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Сярэдняя школа № 2 г. Кобрына

***Прадметы:***

Школы